Родная газета на родной мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

18 САКАВІКА 2008 г.
АЎТОРАК
№ 51 (26164)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫМ ГОДЗЕ!

Працягваецца падпіска на II квартал 2008 года.
Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*	*на 6 месяцаў*
63850 (індывідуальны)	**8800**	**26400**	**52800**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**8300**	**24900**	**49800**
63858 (ведамасны)	**14000**	**42000**	**84000**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**12800**	**38400**	**76800**

Мы едзем!

І нават здагадваемся, хто гэтай весткі чакае найбольш: Валянціна Рыгораўна Губарэвіч з Дзяржынска, Людміла Іванаўна Радзюк з Навагрудка і Яўгенія Валяр'янаўна Шмыгіна з г.п. Любча, бо менавіта яны па выніках падпіскі на першы квартал 2008 года выйгралі звяздоўскія супер-прызы і, зразумела ж, хацелі б іх атрымаць...

У адпаведнасці з гэтымі жаданнямі складзены чарговы маршрут для маленькага звяздоўскага дэсанта. Такім чынам, 19 сакавіка, раніцай ён прыбудзе ў г. Дзяржынск, каб па магчымасці ўрачыста перадаць мікрахвалевую печ падпісчыцы В.Р. Губарэвіч. Пачатак сустрэчы ў 10 гадзін 30 хвілін. Месца — фае дзяржынскай швейнай фабрыкі «Эліз». У 16 гадзін дзень падпісчыка «Звязды» адбудзецца ў актавай зале СВК «Прынёманскі» г.п. Любча, дзе жыве Я.В. Шмыгіна, шчаслівая ўладальніца халадзільніка «Атлант» і куды па свой тэлевізар «Віцязь» прыедзе (спадзяёмся) Л.І. Радзюк з Навагрудка і І.В. Будырка з в. Каменка, якая выйграла колісь бейсболку з лагатыпам газеты.

А яшчэ, хоць і з дробнымі пакуль прызамі, мы вырашылі завітаць у Карэлічы. Сустрэча там ладзіцца ў школе мастацтваў (побач з будынкам райвыканкама), пачатак у 14 гадзін. Прыходзьце, бо ў праграмах, як заўсёды, узаемныя знаёмствы, расказы пра амаль векавую гісторыю «Звязды» і яе дзень сённяшні, прэзентацыі найбольш папулярных рубрык і кніг Анатоля Клешчука, Яўгена Пясецкага, Валянціны Доўнар, віктарына і розыгрыш прызоў, вершы і байкі са скарбонкі беларускага народнага гумару, свята шчырых сяброўскіх зносінаў.

Валянціна ДОЎНАР, Таццяна ЛЯЎКОВІЧ, Уладзімір ЗДАНОВІЧ, Яўген ПЯСЕЦКІ.

МЗС Беларусі настойліва рэкамендуе скараціць колькасць персаналу пасольства ЗША ў Мінску

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў знешнепалітычным ведамстве.

«17 сакавіка ў МЗС Беларусі быў запрошаны Часовы Павераны ў справах Злучаных Штатаў Амерыкі ў Рэспубліцы Беларусь Джонатан Мур. Увага прадстаўніка ЗША была зноў звернута на настойлівую рэкамендацыю беларускага боку аб скарачэнні колькасці персаналу пасольства ЗША ў Мінску», — адзначылі ў Міністэрстве замежных спраў. Як паведамлялася раней, у сувязі з увядзеннем ЗША абмежавальных мераў адносна прадпрыемстваў канцэрна «Белнафтахім» пасол Рэспублікі Беларусь у ЗША Міхаіл Хвастоў адкліканы ў Мінск для кансультацый. Адначасова ўрад Беларусі настойліва прапанаваў паслу ЗША ў Мінску Карэн Сцюарт пакінуць Беларусь з той жа мэтай. Карэн Сцюарт 12 сакавіка пакінула тэрыторыю Беларусі па патрабаванні беларускага боку.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Жыхарка вёскі Язвінкі Лунінецкага раёна Надзея ГНІЛКО смакуе свежы кляновы сок.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ПАХАЛАДАЕ

У пачатку гэтага тыдня на тэрыторыю Беларусі накіруецца больш халоднае паветра паўночных шырот і пахаладае. Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Вольга Фядотава.

Захаваецца даволі халоднае надвор'е і 20—21 сакавіка. Пройдзе кароткачасовы снег. На дарогах галалёдзіца. Уначы чакаецца 2—8 градусаў ніжэй за нуль, а ў ноч на 21 сакавіка пры праясненнях магчыма паніжэнне тэмпературы да мінус 10 градусаў. Удзень тэмпература паветра складзе ад 2 градусаў марозу да 5 градусаў цяпла. 22 сакавіка чакаецца парывісты заходні вецер. Пры гэтым будзе крыху цяплей. Уначы — ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, днём — ад 1 да 7 градусаў вышэй за нуль. На большай частцы тэрыторыі пройдуць ападкі: маюць снег будзе змяняцца дажджом. У нядзелю, 23 сакавіка, па поўдні рэспублікі магчыма павышэнне тэмпературы да плюс 10 градусаў.

«БАГАТЫ ЎЛОЎ» ТРАКТАРОЎ

У лесе ноччу супрацоўнікі міліцыі і памежнікі каля в. Новае Забалоцце, што ў Маларыцкім раёне, затрымалі трох хлопцаў: двое з в. Дарапеевічы, адзін з в. Лукава.

Паводле звестак прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта (ДПК), айчынныя кантрабандысты ноччу спрабавалі перагнаць праз мяжу 8 трактароў. Больш за тое, тры трактары цягнулі за сабой прычэпы, адзін — культыватар. Як падкрэслілі ў ДПК, сёлета гэта самы «буйны ўлоў» сельгастэхнікі на беларуска-ўкраінскай мяжы. Памежнікі звязваюць актывізацыю «трактарных» кантрабандыстаў з пачаткам у суседзяў веснавых палявых работ. Беларуская тэхніка карыстаецца ва Украіне вялікім попытам. І наўрад ці гэта была апошняя спроба нелегальнага перамяшчэння трактароў у суседнюю дзяржаву.

Мікола ДЗЯБЁЛА, Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЖЫЦЦЁ ДЗІЦЯЦІ — ЗА ДОЛАРЫ І МАБІЛЬНІК?

У Бабруйску судовая калегія па крымінальных справах Магілёўскага абласнога суда пачала слуханне справы пра забойства 10-гадовага хлопчыка. Старшынствуе на судзе Рыгор Качалаў, паседжанне закрытае.

Падзеі, якія адбыліся ў Бабруйску ў леташнім жніўні, шакіравалі ўсю вобласць: невядомыя ліхадзеі выкралі малога і запатрабавалі ў маці выкуп у некалькі тысяч долараў. А пазней хлопчыка знайшлі мёртвым: дзіця збілі і гвалтоўна ўтапілі.

Вынікі расследавання гэтага злачынства страсянулі яшчэ больш: у страшным злачынстве абвінавачваецца падлетак! На лаве падсудных апынуўся вучань адной з бабруйскіх школ, 1993 года нараджэння. Паводле версіі абвінавачання, падлетак злоўжыў даверам і падмануў хлопчыка, які быў яму знаёмы. Ён прапанаваў набыць петарды і завёў малога да ракі Бярэзіна... Мяркуецца, што прычынамі ўчынення злачынства сталі грошы, якія можна было атрымаць як выкуп, а таксама мабільны тэлефон «Сіменс А-70», які ацэньваецца ў 75 тысяч рублёў. Абвінавачанне прагучала на судзе: асабліва жорсткае наўмыснае забойства малалетняга, спалучанае з выкраданнем чалавека. Калі віна абвінавачванага будзе даказана, яму пагражае да 15 гадоў зняволення.

Алена КАЗЛОВА.

СУПЕРГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР — У ПОЛАЦКУ

Сёмы год запар галоўныя бухгалтары рэспублікі правяралі ўзровень сваіх ведаў на конкурсе «Лепшы галоўны бухгалтар 2007 года», які праводзяць Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь, ТАА «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» (выдавец часопіса «Галоўны Бухгалтар») і Беларуская асацыяцыя бухгалтараў.

У першым туры конкурсу ўзялі ўдзел 598 спецыялістаў, а ў фінал выйшаў 41 удзельнік. З іх журы вызначыла васьмёрку самых лепшых у намінацыях — лепшы галоўны бухгалтар прамысловасці, гандлю, сельскай гаспадаркі, транспартнай галіны, будаўніцтва, банка, бюджэтнай арганізацыі, а таксама лепшы рэвізор года. Званне «Супергалоўны бухгалтар 2007 года» заваявала Жана Хорак, галоўны бухгалтар ААТ «Тэхналіт Полацк» з г. Полацка.

Святлана БАРЫСЕНКА.

УП «Минский городской центр недвижимости» сообщает:

В извещении о проведении 71-го открытого аукциона на право заключения договора аренды (сроком на 5 лет) нежилых неиспользуемых помещений коммунальной собственности г. Минска, опубликованном в газете «Звязда» 15.03.2008, в строке 21 следует читать:

21	Логойский тракт, 1, корп.1, помещение на 1 этаже (под непроизводственное — офис, смешанное (за исключением производства, торговли, оказания услуг))	137,8	2500

УНП190398583

Грошы

Долар — у штопары

Падзенне курса амерыканскай валюты выходзіць з-пад кантролю?..

Учора ля «абменнікаў», мабыць, кагосьці непрыемна ўразіў чарговы скачок амаль на сотню рублёў курсу продажу наяўнага еўра. Прынамсі, далёка не кожны з тых, хто хацеў канвертаваць свае грошы ў панядзелак у еўрапейскую валюту, зрабіў гэта: 3400 рублёў за 1 еўра — гэта падавалася некаторым людзям занадта высокім курсам. Іншая справа, што нічога дзіўнага на валютным рынку нашай краіны не адбылося: падобнае развіццё падзей тлумачыцца захаваннем крайне неспрыяльнай сітуацыі на міжнародных біржах, дзе долар імкліва губляе пазіцыі да еўра.

У пачатку ўчарашніх таргоў на сусветным валютным рынку долар у чарговы раз абнавіў рэкордны мінімум у адносінах да еўра, аслабеўшы з папярэднімі прыблізна на 1,5 працэнта: за 1 еўра ўжо плацілі каля 1,58 долара. Такім чынам, цалкам пацвярджаецца прагноз экспертаў нашай газеты, якія «насурочылі» далейшае зніжэнне курсу амерыканскай валюты.

Наогул, падзенне амерыканскай валюты, як лічаць аналітыкі, ужо выходзіць з-пад кантролю. Нездарма ў некаторых краінах выказваюць меркаванне наконт таго, што прыйшоў час умяшацца ў тое, што адбываецца на сусветных рынках і спыніць далейшы абвал долара. У прыватнасці, некаторыя кіраўнікі цэнтрабанкаў і міністры фінансаў прызнаюць неабходнасць узгодненай інтэрвенцыі. Так, міністр фінансаў Японіі Фукасіра Нукага заявіў, што наступіў час для ўмяшання манетарных уладаў. «Неабходна правесці перамовы з Еўрапейскім цэнтрабанкам і ФРС Злучаных Штатаў, абмеркаваць тое, што адбываецца на сусветным валютным рынку і прыняць меры для таго, каб спыніць далейшае падзенне нацыянальнай валюты ЗША», — зазначыў ён.

— Многія краіны, у тым ліку Расія і Кітай, маюць вялікую колькасць долараў і проста не ведаюць, што з імі рабіць, — каментуе падобную ініцыятыву **кіраўнік Цэнтра макраэканамічных даследаванняў Інстытута эканомікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр ЛУЧАНОК.** — Таму яны проста вымушаны выратоўваць эканоміку Злучаных Штатаў.

— У адной з нашых гутарак вы казалі пра тое, што курс долара можа дайсці да канца года да суадносінаў 1,7 долара за еўра. На сёння за адзін еўра даюць ужо амаль 1,6 долара. Магчыма, у сувязі з гэтым ваш прагноз таксама мае патрэбу ў карэктаванні?

— Я думаю, што, па першае, у бліжэйшай перспектыве ўсё будзе залежаць ад паводзінаў ФРС ЗША. А па другое, — ад узроўню развіцця рэцэсіі ў Злучаных Штатах: чым большай яна будзе, тым больш упадзе курс долара. Таму дакладна нешта прагназаваць не даводзіцца. Аднак, на мой погляд, ЗША паспрабуюць перакласці свае эканамічныя праблемы на іншых шляхам зніжэння курса долара. Як я ўжо ўзгадваў, многія з краін проста маюць занадта шмат долараў і нічога на іх не могуць купіць, гэта значыць, за долярамі няма тавару. Таму хочуць такія дзяржавы гэтага, ці не — яны вымушаны падтрымліваць долар.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

«Прамая лінія»

ПЕНСІЙНАЯ ТЭМА: «ПРЫВАТНЫЯ» ПРАБЛЕМЫ

Два з паловай мільёна пенсіянераў, і амаль у кожнага з іх — «сваё» пытанне. Што будзе з памерамі сацыяльных пенсій і дапамог па доглядзе састарэлых ва ўзросце больш за 80 гадоў ці інвалідамі, як «адшукаць» звесткі аб ранейшых заробках, што залічваецца ў стаж, ці магчыма перайсці з адной пенсіі на другую і, уласна кажучы, што такое індывідуальны каэфіцыент — усё гэта і іншае сталася тэмай чарговай «прамой лініі» газеты «Звязда». Але аб усім па парадку. Такім чынам, на званкі нашых чытачоў адказвае начальнік галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Вікенцьеўна КАРАЛЁВА.

☎— З 1955 па 1970 год працавала, з 1970 года па 1982 год гадавала 5 дзяцей, потым зноў працавала, у 1991 годзе выйшла на датэрміновую пенсію, аднак і затым яшчэ дзесяць гадоў не пакідала работу. Чаму ж у выніку атрымалася такая маленькая пенсія — усяго 220 тысяч рублёў?

Леакадзія Сцяпанаўна Сярвінская, Валожынскі раён

— Як вядома, пенсія залежыць ад дзвюх акалічнасцяў — стажу і заробку. Стаж у вас сапраўды атрымаўся добрым, а вось зарплата, мяркуючы па ўсім, была невысокай. І адзінае выйсце ў такой сітуацыі сёння — паспрабаваць разлічыць індывідуальны каэфіцыент заробку за нейкі іншы перыяд. Хутчэй за ўсё, падчас выхаду на пенсію ў 1991 годзе, вам разлічылі каэфіцыент за апошнія два гады работы. Аднак тут ёсць яшчэ адзін варыянт — звярнуцца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і папрасіць, каб разлічылі каэфіцыент за любыя 5 гадоў запар з 15 апошніх гадоў работы перад выхадам на пенсію. І, магчыма, гэты варыянт акажацца больш выгадным.

☎— Ці разумеюць у міністэрстве, наколькі нізкімі з'яўляюцца цяпер дапамогі па доглядзе інвалідаў I групы і састарэлых ва ўзросце больш за 80 гадоў?

І другое пытанне. Ці не было б правільным у сувязі з упарадкаваннем ільгот адмяніць абмежавальны каэфіцыент 1,3 для працуючых пенсіянераў?

Віктар Іванавіч, Аршанскі раён

— Міністэрства падрыхтавала ўжо свае прапановы аб павелічэнні дапамог па доглядзе інвалідаў I групы і састарэлых ва ўзросце больш за 80 гадоў. Прычым, спадзяюся, што гэта пытанне ў рэшце рэшт будзе вырашана станоўча. І наконт другой праблемы. Прычына яе вядомая — абмежаванасць пенсійных сродкаў.

(Працяг на 2-й стар.)

Прэзідэнт Беларусі павіншаваў...

...прэзідэнта Ірландыі Мэры Макаліс з нагоды нацыянальнага свята — Дня Святога Патрыка. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што ўсебаковыя сувязі паміж дзвюма краінамі і ў далейшым будуць пашырацца на карысць народаў Беларусі і Ірландыі.

...лаўрэата Нобелеўскай прэміі, віцэ-прэзідэнта Расійскай акадэміі навук, дэпутата Дзяржаўнай Думы Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі акадэміка Жарэса Алфёрава з днём нараджэння. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што высокі прафесіяналізм акадэміка, багаты вопыт, актыўная грамадская пазіцыя будуць і ў далейшым садзейнічаць развіццю ўзаемавыгадных беларуска-расійскіх сувязяў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МІКАЛАЙ ЧАРГІНЕЦ І АНАТОЛЬ ЯРМОЛЕНКА ЎДАСТОЕНЫ РАСІЙСКІХ ОРДЭНАЎ ДРУЖБЫ

Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мікалай Чаргінец і мастацкі кіраўнік ансамбля «Сябры» Анатоль Ярмоленка ўдастоены расійскіх ордэнаў Дружбы. Указы аб іх узнагароджанні падпісаў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, паведамілі карэспандэнту **БЕЛТА** ў прэс-службе Крамля.

Открытое акционерное общество «Савушкин продукт»

извещает своих акционеров о проведении очередного общего собрания акционеров.
Собрание состоится 28 марта 2008 года в 15.00 по адресу: г. Брест, ул. Янки Купалы, 108, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об уменьшении размера уставного фонда Общества путем аннулирования акций.
2. О внесении изменений и дополнений в устав Общества.
3. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2007 г. и основных направлениях деятельности Общества на 2008 г.
4. Отчет Наблюдательного совета.
5. Отчет Ревизионной комиссии Общества.
6. Утверждение годовой бухгалтерской отчетности Общества за 2007 г.
7. О выплате дивидендов Общества за 2007 г.
8. О порядке распределения и использования чистой прибыли Общества на 2008 г. и I квартал 2009 г.
9. Определение размера вознаграждения для членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
10. Избрание членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии Общества.
11. О покупке акций.
12. О согласовании переоценки индексным методом.
13. О безвозмездной (спонсорской) помощи.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 21 по 27 марта 2008 года по месту нахождения Общества: г. Брест, ул. Я. Купалы, 108, с 9.00 до 17.00 (приемная), 28 марта 2008 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания: с 14.00 по 14.50 в день и по месту проведения собрания по предъявлению документа, удостоверяющего личность; представителей акционеров — по предъявлению доверенности, руководителей юридических лиц-акционеров — документа, подтверждающего полномочия.

УНП 200030514 **Наблюдательный совет**

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ВЫЗНАЧЫЎСЯ ПЕРАЕМНІК КІТАЙСКАГА ЛІДАРА

Парламент Кітая — Усекітайскі сход народных прадстаўнікоў — абраў асноўных кіраўнікоў краіны і фактычна вызначыў, хто зойме пост старшыні Ху Цзіньтао пасля 2013 года, калі той у адпаведнасці з канстытуцыяй пакіне ўсе кіруючыя пасты. Намеснікам кіраўніка КНР стаў 54-гадовы Сі Цзіньпін. Пакуль жа Ху Цзіньтао захаваў пасты старшыні КНР і старшыні Цэнтральнага ваеннага савета КНР.

КОСАВА: БОЛЬШ ЗА 100 ПАРАНЕНЫХ

Штурм суда і масавыя арышты сербаў у найбуйнейшым сербскім анклаве Косаўскай Мітравіцы справакавалі беспарадкі і сутыкненні сербаў з паліцыяй ААН і сіламі KFOR, у якіх раненні атрымалі больш за 100 чалавек. У шпіталі паступіла каля 70 грамадзянскіх асобаў, з іх 17 — цяжка параненыя.

Учора раніцай падраздзяленні паліцыі ААН і вайскоўцы KFOR узялі штурмам будынак акружнога суда, які з 15 сакавіка быў захоплены групай юрыстаў-сербаў. Усе юрысты, што блакіравалі будынак, былі арыштаваныя, але неўзабаве паліцэйскіх блакіравалі сербы, якія падаспелі на выручку суайчыннікам. Падчас сутыкненняў сіламі правапарадку быў выкарыстаны слёзацечны газ. Незадаволеныя сербы закідалі паліцэйскіх і вайскоўцаў каменнем і бутэлькамі з запальнай сумессю, падпалілі 4 аўтамабілі KFOR і паліцыі ААН. Падчас сутыкненняў раненні розныя ступені цяжкасці атрымалі 26 польскіх паліцэйскіх. Учора ж пры абстрэле паліцэйскага ўчастка ў Косаве былі параненыя 14 грамадзян Украіны, якія ўдзельнічаюць у міжнароднай міратворчай місіі.

У АЛБАНІІ ПРЫ ВЫБУХУ ЗАГІНУЛІ 11 ЧАЛАВЕК



Колькасць ахвяраў выбухаў на складзе боепрыпасаў у Албаніі дасягнула адзінаццаці чалавек пасля таго, як выратавальнікі знайшлі яшчэ два целы. Па-ранейшаму зніклімі без вестак лічацца дванаццаць чалавек.

У выніку серыі выбухаў на складзе боепрыпасаў непадалёк ад сталіцы Албаніі Тыраны раненні атрымалі амаль 300 чалавек. Больш за пяцьсот дамоў былі разбураныя цалкам або часткова, каля двух тысяч будынкаў атрымалі нязначныя пашкоджанні. Выбуховая хваля выбіла ўсе вокны ў размешчаным непадалёк ад албанскай сталіцы міжнародным аэрапорце, у выніку чаго ён быў закрыты. НЗ на складзе адбылася ў суботу. Снарады ўзрываліся амаль суткі, што вымусіла выратавальнікаў затрымаць аперацыю па пошуку пацярпелых. У момант аварыі на складзе, паводле афіцыйнай інфармацыі, знаходзіліся больш за 120 чалавек. Інцыдэнт вымусіў мясцовыя ўлады эвакуіраваць больш за 4 тысячы чалавек з бліжэйшых населеных пунктаў.

СУПРАЦОЎНІК КІРГІЗСКАГА ВАЕНКАМАТА ЗАТРЫМАНЫ ЗА ВЫМАГАННЕ ІНДЫКА

Супрацоўнік аднаго з ваенкаматаў кіргізскага горада Таш-Кумыр затрыманы пры атрыманні хабару.

Свае паслугі, паводле даных IA Central Asian News, ён ацаніў у 27 долараў і індыка. Як паведамляе прэс-служба МУС рэспублікі, прыхіндзей вымагаў хабар у мясцовага жыхара за тое, каб паставіць яго сына на вайсковы ўлік.

НОВЫ СТАРШЫНЯ АГРАРНАЙ ПАРТЫІ

Новым старшынёй Аграрнай партыі абраны Міхаіл Русы — старшыня пастаяннай камісіі па аграрных пытаннях Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі. За яго кандыдатуру прагаласавала большасць дэлегатаў V партыйнага з'езда, які адбыўся 15 сакавіка ў Мінску.

Дэлегаты зацвердзілі таксама новую назву партыі — Беларуская аграрная партыя. Партыя налічвае каля 8 тыс. чалавек — гэта выкладчыкі, рэдактары газет, служачыя дзяржустаноў, работнікі сельскагаспадарчых і прамысловых прадпрыемстваў.

Андрэй МАЛАХОЎСКІ, БЕЛТА.

ПЕНСІЯНЕР ВЫПАЎ З БАЛКОНА

У Мінску ў адным з дамоў па вуліцы М. Багдановіча пры добраўпарадкаванні балкона кватэры здарылася няшчасце — 59-гадовы пенсіянер сарваўся з вышыні ўніз і разбіўся.

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, мужчына працаваў у кватэрсэ 69-гадовай пенсіянеркі на пятым паверсе дома...

Ігар ГРЫШЫН.

«ЗАМІНІРАВАНЫ» ЦЯГНІК

У пятніцу на дзве з паловай гадзіны быў затрыманы цягнік «Слуцк—Баранавічы»: праваахоўнікі правяралі яго вагоны на наяўнасць выбуховага прыстасавання.

Трывожнае паведамленне ў Слуцкі РАУС паступіла каля а палоўвы шостай вечара па тэлефоне «102»: невядомы папярэдзіў аб тым, што ў цягніку закладзена «бомба».

Аднак, як бывае ў такіх выпадках, інфармацыя не пацвердзілася, а вось асобы «жартаўнікоў», якія стварылі людзям праблемы, устанавіць удалося. Як высветлілася, тэлефоннымі «тэрарыстамі» аказаліся тры вучні сярэдняй школы — васьмікласнік, сямікласнік і пяцікласнік...

Дзмітрый СТАНКОВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 08051

КУРСЫ ВАЛЮТ

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.03.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 146,00
1 еўра	3 390,57
1 латвійскі лат	4 859,60
1 літоўскі літ	982,69
1 чэшская крона	134,80
1 польскі злоты	951,33
1 расійскі рубель	91,27
1 украінская грыўня	429,14

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў
Цэнтрабанк РФ

USD	23,5126
10 UAH	46,1874
1000 BYR	10,9495
EUR	37,1123

Курс у гандлёвых кампаніях (на 17.03.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Во даюць!

МАЕ ВАЛАСЫ — МАЁ БАГАЦЦЕ

Алмазы ў Беларусі сінтэзуюць нават з... валасоў!

А дакладней з таго, што ад іх застаецца пасля спальвання ў асаблівых умовах: пры высокай тэмпературы і без падачы кіслароду ў печ (уяўляеце, гарэнне без кіслароду — здавалася б, нонсенс!). «Украпаць» у будучы брыльянт — сінтэзуецца ён па большай частцы ўсё ж з графіту — можна локан валасоў блізкага чалавека ці крыху поўсці ненагляднага хатняга гадаванца. А для мужчын, якія лысеюць, гэта і ўвогуле апошні шанц зберагчы сваё багацце...

Усе «вырашчаныя» алмазы – каньячнага колеру, «расфарбоўваюць» іх ужо ў далейшым падчас асобнага тэхналагічнага працэсу.

Спаленыя валасы — гэта прысак, у аснове якога па сутнасці вуглярод, алмаз жа і ёсць вуглярод, толькі ў крышталічнай форме. Кажуць, такія эксклюзіўныя брыльянты — з часцінкай самога ўладальніка — вельмі модныя на Захадзе: забяспечаныя людзі не супраць увекавечыць сябе і сваю сям'ю ў ... брыльянтах. Прыгожа, а галоўнае, экзатычна!

— Для таго, каб заказаць такі незвычайны брыльянт, патрэбны лёгкія дурыкі ў галаве і мноства грошай у кашальку, — упэўнены **Уладзімір ФЯДОРЧАНКА, намеснік дырэктара па маркетынгу навукова-вытворчага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Адамас БДУ»** (прынамсі, стаж работы з алмазамі ва Уладзіміра Міхайлавіча — звыш 30 гадоў, на «досвітку» сваёй кар'еры ён быў аграншчыкам-тэхнолагам па апрацоўцы алмазаў у брыльянты), дзе цудоўныя ператварэнні графіту ў алмазы адбываюцца штодня.

Чаму менавіта валасы, а не пазногці ці, скажам, дробненькія кавалачкі скуры? Неабавязкова даваць менавіта валасы ў алмаз пры сінтэзе — тэарэтычна для гэтага падыдзе ўсё, што можна спаліць, ператварыўшы тым самым у попел. Аднак калі хочацца менавіта індывідуальнасці, валасы — бясспрэчны варыянт.

— Некалькі дзесяцігоддзяў таму крыміналісты вызначылі, што валасы чалавека маюць уласцівасць назапашваць цяжкія металы ў пэўных прапорцыях і ў абсалютна індывідуальным парадку, — тлумачыць Уладзімір Міхайлавіч. — Такая экспертыза ў нечым падобная да дактыласкапічнай — таксама з'яўляецца ўнікальнай характарыстыкай індывідуума, і ідэнтыфікаваць чалавека паводле саставу цяжкіх металаў у валасах можна з той жа верагоднасцю, што і па адпячатках пальцаў. Тэарэтычна, калі брыльянт зроблены з валасоў уладальніка, то экспертыза каменю дазволіць устанавіць яго асобу. Аднак цяжкасці могуць узнікнуць з тым, што не па ўсім брыльянце сыравіна распаўсюдзіцца раўнамерна.

Таму такія брыльянты, хутчэй, для таго, каб пацешыць свайго гаспадара, чым прыносіць сітуацыю для эксперта-крыміналіста. Для беларусаў «валасяныя» брыльянты, на думку Уладзіміра Міхайлавіча, неактуальныя: «Нашы людзі не заклапочаны тым, куды б патраціць лішні дзесятак тысяч долараў». Таму «Адамас БДУ» выконвае заказы швейцарскага і расійскіх прадпрыемстваў, якія самі рыхтуюць неабходную сыравіну з валасоў кліентаў і пастаўляюць парашочак, гатовы да прымешвання ў графіт.

(Заканчэнне на 3-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў Пагадненне паміж Беларуссю і Венесуэлай аб культурным супрацоўніцтве

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 17 сакавіка сваім указам зацвердзіў Пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Баліварыянскй Рэспублікай Венесуэла аб культурным супрацоўніцтве. Указ уступае ў сілу з дня яго падпісання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Рэгіёны Расіі заявілі аб сваім удзеле ў беларускай выстаўцы СМІ

Міжнародная спецыялізаваная выстаўка «СМІ ў Беларусі» пройдзе з 28 красавіка па 1 мая ў Мінску. Чакаецца вялікая колькасць удзельнікаў: як беларускіх сродкаў масавай інфармацыі, так і замежных. Многія рэгіёны Расіі ўжо заявілі аб сваім удзеле ў маючым адбыцца форуме, у прыватнасці Ніжагародская і Калінінградская вобласці, Краснаярскі край і іншыя, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія Ананіч.

«Нязвычайна цікавасць з боку рэгіёнаў Расіі, якія, можа быць, сёння яшчэ не знаходзяцца на нашым інфармацыйным полі, але хочуць у нас распаўсюдзіцца», — адзначыла першы намеснік міністра. Яна падкрэсліла, што Беларусь знаходзіцца з Расіяй у адзіным інфармацыйным полі, дзе няма межаў для пашырэння друкаваных СМІ. Але разам з тым беларуская прэса пакуль што не набірае вялікіх тыражоў у Расійскай Федэрацыі. Над гэтым трэба працаваць. «Мы чакаем ад выстаўкі ўмацавання прафесійных асноў, выхаду нашых СМІ на добрыя творчыя праекты з расійскімі рэгіянальнымі выданнямі», — сказала Лілія Ананіч.

Паводле яе слоў, у час работы выстаўкі адбудзецца 3-і Беларускі інфармацыйны форум, які «абяцае быць цікавым». «Тэма яго сугучная з часам — мы будзем гаварыць аб ролі СМІ ў захаванні нацыянальнай самабытнасці, суверэнных рыс кожнай дзяржавы і ў той жа час у шырокіх інтэграцыйных працэсах, у тым ліку ў фармаце СНД, ЕС, Саюзнай дзяржавы», — дадала першы намеснік міністра.

У гэтым годзе Міністэрства інфармацыі Беларусі прапрацоўвае пытанне ўдзелу ў беларускай выстаўцы ў якасці ганаровага госця СМІ Украіны. «Гэта жаданне грунтуецца на тым, што ўкраінская прэса вельмі актыўна сёння прасоўваецца на наш рынак. У адпаведнасці з беларускім заканадаўствам у нас дазвольны прынцып уваходу ў інфармацыйнае поле замежных СМІ. Калі нашы суседзі да нас імкнуцца, то і мы павінны не адставаць, паказваць сябе, прасоўваць свае праекты», — лічыць Лілія Ананіч.

«ЗАЛАТЫЯ» ШЧУПАКІ

На Спораўскім возеры, што ў Драгічынскім раёне, былі затрыманы двое жыхароў вёскі Какорыца, якія здабылі 29 шчупакоў. Браканьеры ведалі, што падчас нарасту, з 1 па 31 сакавіка, лавіць шчупакоў забаронена, але тым не менеў узялі ў рукі восці.

Для браканьераў тыя шчупакі сталі залатымі. Ім давядзецца заплаціць за шкоду нанесеную прыродзе, прыкладна 3 мільёны рублёў, а яшчэ і штраф, які можа дасягнуць 50 базавых велічынь.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

У рэдакцыю «Звязды» прыйшоў ліст з аграгарадка Баркалабава Быхаўскага раёна. На пяці друкаваных старонках ад імя рабочых СВК «Баркалабаўскі» расказваецца пра найноўшую гісторыю гэтай гаспадаркі і цяперашнюю «найскладанейшую абстаноўку» ў ёй. Аўтар (альбо аўтары) моцна занепакоены далучэннем «Баркалабаўскага» да суседняга сельскагаспадарчага прадпрыемства «Макранскі», у выніку чаго цэнтрам гаспадаркі стане Мокрае, а не Баркалабава.

Марыю Пятроўну Іванову, імя якой пазначана на канверце, у той акрузе ніхто не ведае. Тым не менш гэты ліст поўны хваляванняў людзей за свае працоўныя месцы і далейшы лёс: «Просім і спадзяёмся на ўдзел у захаванні нашай гаспадаркі, каб нашы дзеці не шукалі працы ў горадзе, а былі ўпэўненыя, што ў іх ёсць дах над галавой і праца ў калгасе».

Баркалабава — вядомае старажытнае паселішча на беразе Дняпра, тут месціліся праваслаўныя манастыры і створаны помнік беларускага летапісання — Баркулабаўскі летапіс.

Сёння Баркалабава — добраўпарадкаваны аграгарадок з належнай сацыяльнай структурай. Толькі на сельскі Дом культуры ў 2006 годзе выдаткавалі амаль мільярд рублёў! А вось з вытворчай сферай ёсць праблемы. Аб'ём прадукцыі пасля вялікіх фінансавых укладанняў не павялічваецца, а, наадварот, падае. Таму зусім не выпадкова СВК «Баркалабаўскі» вырашылі аб'яднаць з больш паспяховай гаспадаркай. І на гэты конт ёсць розныя меркаванні.

Лідар Баркалабаўскага сельскага Савета **Іван СКРЫПЦОЎ** шмат гадоў узначальваў калгас імя Лібкнехта: гаспадарка потым змяніла імя нямецкага рэвалюцыянера на звыклую мясцовую назву «Баркалабаўскі».

Сітуацыю ў роднай гаспадарцы Скрыпцоў тлумачыць эканамічнымі законамі:

— У нас тут прыпойменныя землі, перамытыя пяскі з балам 24. Толькі на 500 гектарах, гэта трэць ад агульнай пашы, можна сеяць рэнтабельна, у астатнія толькі грошы закопваць. У гаспадарцы цяпер 1300 галоў жывёлы, з іх 580 — высокадойныя каровы. На такіх землях іх не пракарміць. Хочаш не хочаш, а трэба шукаць дапамогі на баку.

З гэтых высноў былы старшыня калгаса падтрымлівае аб'яднанне высілкаў і рэсурсаў з «Макранскім».

— Простаму чалавеку трэба, каб праца была і каб за яе плацілі своечасова. А якая гаспадарка — ці гэта важна? — рытарычна пытаецца Іван Скрыпцоў.

Аляксандр ТУРЫН узначальвае СВК «Баркалабаўскі» толькі тры месяцы. Яго асноўная задача адносна вытворчасці — захаваць статак у складаны перыяд рэарганізацыі гаспадаркі.

— У нас цяжкае фінансавае становішча, — пацвярджае кіраўнік. — Лічбу даўгоў нават называць баюся: 1,5 мільярда дакладна ёсць. Мы цяпер плацім людзям мінімальны заробак, а паляводам і гэтага не атрымліваецца.

Цяпер у гаспадарцы нядрэнныя надоі. Аднак гэтага мала, каб выкараскацца з даўгавой яміны.

— Далучэнне да суседняй гаспадаркі — апошні крок ад безвыходнасці, — хітае галавой мужчына. — Альтэрнатыва гэтаму была: болей даіць, змагацца за ўраджай.

Аляксандр Турын скардзіцца, што ў гаспадарцы ёсць людзі, якіх трэба прымушаць працаваць, утрыманства стала звычайнай справай — маўляў, усё дай і дай. З іншага боку, старшыня лічыць, што ўгаварыць чалавека добра працаваць можна добрым заробкам, якога тут даўно не бачылі.

— Я са свайго боку раю людзям не спадзявацца, што ўсё без іх, але для іх карысці, вырашыцца, — кажа Турын. — Трэба быць больш актыўнымі.

У Баркалабаве запэўнілі, што большасць працаўнікоў падтрымала аб'яднанне на агульным сходзе і што незадаволеных прынятым рашэннем не больш за 1 працэнт ад агульнай колькасці. Шчыра кажучы, сустрэчы з людзьмі гэту сціплую лічбу не пацвердзілі. Незадаволеных і расхваляваных значна болей.

— Так, мы былі на сходзе, але ніхто пра наша меркаванне не пытаўся, — расказваюць **жанчыны з брыгады паляводаў**. — Нам сказалі, што мы — банкруты, не выканалі прагнозныя паказчыкі, адны не выжывем і таму далучаемся да «Макранскага». Крыўдна. Мы меней працаваць не сталі, нікога не падводзілі. Чаму ж так сталася?..

— Мокрае за 15 кіламетраў ад нас, — працягвае іншая жанчына. — Але справа не толькі ў адлегласці — мы там будзем чужыя. Таму да аб'яднання я стаўлюся насцярожана.

— Хвалюемся за працу, — тлумачыць жанчына. — Мы цяпер атрымліваем 130—150 тысяч рублёў. Хацелі б, вядома ж, такія заробкі, пра якія ў газетах пішуць: хоць бы тысяч 300, і тое нядрэнна было б. А нас пужаюць, што ў «Макранскім» будзем атрымліваць яшчэ меней, чым цяпер.

— Ад нас усе адмовіліся, — лічыць паляавод. — Калі б у нас быў добры кіраўнік, мы маглі б выжыць.

Баркалабаўская ферма ўжо была ў цэнтры ўвагі прэсы і кантрольных органаў. Здавалі яе пазней, чым прынялі ўвесь аграгарадок. Цяпер тут даюць, малако ідзе вышэйшым гатункам. Вось толькі праблема — назапашаныя кармы заканчваюцца.

— Нармальна жылі, працавалі і — трах-бах, самі не выплывем, — кажа жанчына. — Жывёла добрая, малако добрае, з кармамі можна нешта прыдумаць. Але далучэнне — не выйсце са становішча. Мне падаецца, што будзе горш.

— Мы баімся гэтага далучэння, — прызнаецца даярка. — Дзе той цэнтр калгаса, а дзе мы? Мяркуем, што кіраўнік будзе глядзець свой калгас, а мы — участак, і гэтым усё сказана.

— У нас тут — школа, дзіцячы садок, Дом культуры, крамы, для дзяцей нават трэнажорную залу зрабілі, царкву рэстаўруюць, — крычыць яе калега. — Было Баркалабава — а цяпер не будзе. Летапіс пісалі, а цяпер не трэба.

Абмеркаванне на ферме пераўтварылася ў гвалт. Былі пасярод іншых выкрыкаў і за далучэнне гаспадаркі. Праўда, іх было меней за іншыя.

— Горш не будзе! — сказала работніца. — І можа, будзе нават лепей. Наша справа — даіць: колькі заробіш — столькі і атрымаеш.

— Ды і што нам казаць? За нас усё вырашыла начальства, — падвяла вынік жанчына. — Што ж, прыгожыя словы нам чуць не ўпершыню. Паглядзім, што атрымаецца насамрэч.

УКСП «Макранскі» ўзначальвае **Ніна НАЗАРЭВІЧ**. Два гады таму яна, педагог, прыняла гаспадарку, якая была ў жахлівым стане. Назарэвіч нікога не выганяла, але запатрабавала ад усіх памяняць сваё стаўленне да працы. Цяпер «Макранскі» лічыцца моцнай гаспадаркай, якая павялічвае аб'ёмы вытворчасці.

— Разгільдзяйства не выношу, — прызнаецца людзей: а хто б не хваляваўся за свае працоўнае месца і заробак, за падыходы новага кіраўніцтва. Але ад скаргаў і эмоцый кармоў не прыбаўляецца...

Такім чынам, **альтэрнатывы аб'яднанню няма**. Так сцвярджаюць усе кіраўнікі, з якімі давялося размаўляць на Быхаўшчыне. І хоць у гэта да канца не вераць простыя працаўнікі, аб'яднанне гаспадарак — справа вырашаная.

— Там магутная гаспадарка, якая плануе нарошчваць пагалоўе, так што людзі без працы не застануцца, — прагназуе Іван Скрыпцоў. — На мой погляд, будзе толькі лепей.

— Я разумею трывогі людзей, але яны неабгрунтаваныя, — запэўнівае Ніна Назарэвіч. — Усе застануцца на сваіх працоўных месцах — людзей я мяняць не збіраюся, кожны можа працаваць добра.

— Быў калісьці такі час, калі развалены «Макранскі» хацелі далучыць да больш трывалага «Баркалабаўскага», — адзначыў напрыканцы Мікалай Кароцін. — Таму трэба працаваць. А ўлада нікога не кіне: мы скіраваныя не на заняпад, а на развіццё.

Ілона ІВАНОВА.

Быхаўскі раён.

БАРКАЛАБАВА: «Баімся аб'яднання, хвалюемся за працу і заробкі. Мы ў Мокрым будзем чужыя».

МОКРАЕ: «Нічога рэвалюцыйнага — добра працаваць, без разгільдзяйства, і ўсё ў нас з баркалабаўцамі атрымаецца».

ПЕНСІЙНАЯ ТЭМА: «ПРЫВАТНЫЯ» ПРАБЛЕМЫ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.)

Ва ўмовах гэтай абмежаванасці галоўнай задачай становіцца забеспячэнне вартых выплат людзям, для якіх пенсія з'яўляецца адзінай крыніцай даходу. Таму для разліку пенсій непрацуючым пенсіянерам прымаецца пад увагу каэфіцыент да 4,0. Што ж да пенсіянераў працуючых, то для іх сапраўды дзейнічае абмежавальны каэфіцыент 1,3. Адна справа, калі чалавек, які выйшаў на пенсію, працягвае працаваць, і зусім іншая, калі ён звальняецца. Менавіта таму, кажуць эксперты, і трэба адзначыць, што працуючыя пенсіянеры маюць другую, і больш важкую крыніцу даходаў — зарплату.

☎— *Майму сыну пасля дасягнення 18-годдзя прызначылі III групу інваліднасці і пенсію ў 50 тысяч рублёў. Як можна пражыць на такія грошы?*

Галіна Уладзіміраўна, г. Старыя Дарогі

— Сацыяльная пенсія ні ў якім разе не можа быць большай за пенсію працоўную — гэта зразумела. Разам з тым згодная, што праблема нізкага памеру сацыяльнай пенсіі існуе, і зноў-такі паўтаруся: мы мяркуем вырашыць гэту праблему ў бліжэйшы час.

☎— *З 1978 па 1999 год я працавала ў раёнах Крайняй Поўначы, а сёлета пераехала на сталае месца жыхарства ў Беларусь. Ці змагу я выйсці на пенсію ў 50-гадовым узросце?*

Таццяна Сяргееўна Гаварушка, г. Івацэвічы

— Паводле беларускага заканадаўства, права выйсці на пенсію ў 50 гадоў маюць жанчыны, якія адпрацавалі на Крайняй Поўначы ці ў прыраўнаваных да яе раёнах, адпаведна не менш за 15 і 20 гадоў да 1993 года. У вас, Таццяна Сяргееўна, такога «паўночнага» стажу да гэтага года няма. Разам з тым цяпер вы можаце паспрабаваць атрымаць пенсію ад Расійскай Федэрацыі за 1992—1999 гады.

Для гэтага трэба звярнуцца ў Іванцэвіцкае раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, дзе запоўняць неабходныя дакументы і накіруюць іх у Пенсійны фонд Расіі. І калі расіяне пенсію за работу ў 1992—1999 гадах на Крайняй Поўначы прызначаць, то вы будзеце атрымліваць яе да 55-гадовага ўзросту. А ў 55-гадовым узросце вам прызначаць пенсію і ў Беларусі — ужо за беларускі і «саюзны» стаж. Інакш кажучы, пенсія будзе складацца з дзвюх частак — расійскай і беларускай.

☎— *Ці магу я пайсці на пенсію ў 58 гадоў у сувязі з пераводам прадпрыемства ў іншы горад?*

Уладзімір Іванавіч, г. Мінск

— Не, пайсці ў 58-гадовым узросце на пенсію можна ў выпадку ліквідацыі, але не пераводу прадпрыемства. Разам з тым, калі пасля звальнення па скарачэнні вы зарэгіструецеся ў службе занятасці, будзеце выконваць абавязкі беспрацоўнага і вам не змогуць прапанаваць прымальную работу, то з'явіцца магчымасць выйсці на пенсію ў 59 гадоў. Праўда, яшчэ адна ўмова афармлення пенсіі ў такім узросце — наяўнасць не менш чым 38 гадоў стажу ў мужчын і 33 гадоў стажу ў жанчын.

☎— *Знаходжуся на ўліку ў службе занятасці ў сувязі з закрыццём школы, таму нібыта маю права выйсці на пенсію на год раней. Але пры ўмове, што ў мяне будзе 33 гады стажу. 33,5 года стажу ў мяне ёсць. Аднак яго частка была запрацавана ў 1972—1995 гадах на тэрыторыі Латвіі. А адсюль пытанне: калі нарэшце пачне дзейнічаць беларуска-латвійскі дагавор аб забеспячэнні пенсіянераў?*

Фарыда Аляксандраўна Зайкоўская, Слаўгарадскі раён

— Беларуска-латвійскі дагавор ужо падпісаны, аднак для таго, каб ён пачаў дзейнічаць, трэба правесці шэраг унутрыдзяржаўных працэдур і, у прыватнасці, ратыфікацыю дагавора абедзвюма краінамі і абмен ратыфікацыйнымі граматамі. А на гэта патрэбны час. Таму, мяркуючы па ўсім, дагавор можа запрацаваць толькі напрыканцы года.

☎— *Турбуюць са Шклоўскага раёна, а нагода такая. У верасні мінулага года мужа звольнілі па скарачэнні, а ў сёлетнім маі яму споўніцца 59 гадоў. Ці зможа тады муж, якія мае больш за 38 гадоў стажу і знаходзіцца на ўліку ў службе занятасці, выйсці на пенсію? А, дакладней, ці не зменіцца да гэтага часу наша заканадаўства?*

— Калі муж будзе выконваць усе абавязкі беспрацоўнага і яму не змогуць адшукаць працоўнае месца, то на пенсію ён выйдзе. Прынамсі, не хвалюйцеся: ніякіх зменненяў заканадаўства тут не плануецца.

☎— *Ці залічваецца ў стаж час навучання ў тэхнікуме?*

Валянціна, Круглянскі раён

— Безумоўна, залічваецца.

☎— *Ці праўда, што ў сувязі з упарадкаваннем сацыяльных ільгот скасавана і дапамога на пахаванне? І, калі такая дапамога ўсё ж засталася, патлумачце: як яна разлічваецца?*

Людміла, Вілейскі раён

— Перш-наперш варта заўважыць, што дапамога на пахаванне не з'яўляецца льготай. А, па другое, гэту дапамогу ніхто не скасоўваў.

Паводле Закона ад 12 лістапада 2001 года «Аб пахаванні і пахавальнай справе», асобам, якія ўзялі на сябе арганізацыю пахавання і не атрымалі на гэта гарантаваныя паслугі, выплачваецца матэрыяльная дапамога. Прычым у залежнасці ад статусу памерлага такая дапамога выплачваецца з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, мясцовага або рэспубліканскага бюджэту. Выплата дапамогі робіцца на падставе заявы асобы, якая ўзяла на сябе арганізацыю пахавання, даведкі аб смерці для атрымання такой дапамогі, і шэрагу іншых дакументаў. Пры гэтым сам памер дапамогі на пахаванне складае сярэднюю зарплату рабочых і служачых па краіне за пазамінулы месяц адносна месяца смерці.

☎— *У 1990 годзе выйшаў на датэрміновую пенсію па Спісу № 2, але працягнуў працаваць. Ці павінны былі дадаць стаж за гэту работу?*

І такая сітуацыя. У свой час раённая МРЭК выдала мне пажыццёвае пасведчанне інваліда III групы з дзяцінства. Аднак затым абласная МРЭК запатрабавала дакументы-пацвярджэнні інваліднасці з дзяцінства. Такіх дакументаў, на жаль, няма. Ці можа стаць пацвярджэннем ваенны білет, дзе запісана, што я не прыдатны да вайсковай службы?

Юрый Віктаравіч, г. Магілёў

— Калі вы выходзілі на пенсію ў 1990 годзе, то дадаць стаж вам былі павінны — за работу ад 55-гадовага і да агульнаўсталяванага 60-гадовага ўзросту. Прычым калі тут ёсць сумненні, можна звярнуцца ў аддзел сацыяльнай абароны вашага раёна.

І наконт другога пытання. Для таго, каб звязаць прычыны інваліднасці з захворваннем у дзяцінстве, неабходна прадставіць не вайсковы білет, а менавіта медыцынскія дакументы. А калі медыцынскіх дакументаў няма, устанавіць факт інваліднасці можна толькі праз суд. І, да слова, варта заўважыць: асобам, якім вызначана інваліднасць з дзяцінства пажыццёва, пенсія па ўзросце павялічваецца на 50 працэнтаў мінімальнай пенсіі, або на сёння — прыкладна на 25 тыс. рублёў.

☎— *У 2003 годзе, калі споўнілася 55 гадоў, выйшаў на датэрміновую пенсію паводле Спісу № 2, аднак працягваю працаваць дагэтуль. Я ведаю, што перыяд работы разам з атрыманнем датэрміновай пенсіі пасля 2006 года ў стаж не ідзе. І тым не менш патлумачце: ці залічаць мне пасля дасягнення агульнага пенсійнага ўзросту ў стаж работу за 2003—2006 гады? І ці пераразлічаць з улікам работы пасля выхаду на пенсію каэфіцыент заробку?*

Анатоль Паўлавіч Караленка, г. Крычаў

— Каэфіцыент за работу пасля выхаду на пенсію вам не пераразлічаць, а вось час работы ў 2003—2006 гадах у стаж пойдзе. Прычым па пераразлік стажу пасля дасягнення 60-гадовага ўзросту вы павінны звярнуцца ў раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Матэрыялы «прамой лініі» падрыхтаваў Сяргей ГРЫБ. Фота аўтара.

(Працяг будзе.)

Камандзіроўка па пісьму

МОКРАЕ БАРКАЛАБАВА

Спорт-тайм

У ПАЎФІНАЛЕ ДАМІНУЮЦЬ МІНСКІЯ КАМАНДЫ?

Сёння адбудуцца заключныя матчы 1/4 фіналу хакейнага чэмпіянату краіны (серыя працягваецца да трох перамог адной з камандаў). Калі ў сустрэчах «Дынама» — «Хімвалакно» і «Металург» — «Віцебск» толькі вызначацца ўдзельнікі паўфіналу (пакуль у абодвух выпадках лік у серыі 2:2), то ў іншых паядынках яны ўжо вядомыя. Першым у наступную стадыю прабіўся мінскі «Керамін»: лепшы клуб папярэдняга раўнда экстралігі разграміў гродзенскі «Нёман» ва ўсіх паядынках — 3:0. Да «дваканаў» далучыўся яшчэ адзін прадстаўнік сталіцы. ХК «Юнацтва» быў мацнейшым у сустрэчах з камандай «Хімік-СК»: агульны лік — 3:1.

«КАРОЛЬ» ТАЙЛАНДСКАГА БОКСА

Беларус Дзмітрый Шакута стаў абсалютным чэмпіёнам свету па тайландскім боксе сярод прафесіяналаў і ў 11-ы раз прымерыў карону наймацнейшага байца планеты. Тры паядынкі на турніры ў Нідэрландах мінчанін завяршыў перамогай па вачках.

ТРАКТАРАЗАВОДЦЫ ВЫЙГРАЛІ БЕЗ ВЫХАДУ НА ПОЛЕ

Футбольны сезон адкрылі матчы 1/8 фіналу розыгрышу Кубка Беларусі. Мінскі МТЗ-РІПА прабіўся ў наступную стадыю датэрмінова, бо яго сапернік, жлобінскі «Камунальнік», зняўся з турніру. Астатнім жа ўдзельнікам давялося высвятляць адносіны на полі. Вынікі першых сустрэч: «Дынама» (Брэст) — «Гомель» — 0:2, «Лакаматыў» (Мінск) — «Дынама» (Мінск) — 0:2, «Мінск» — «Шахцёр» (Салігорск) — 0:1, БАТЭ (Барысаў) — «Верас» (Нясвіж) — 1:0, «Хімік» (Светлагорск) — «Мясакамбінат» (Віцебск) — 1:0, «Дарыда» (Жданавічы) — «Нёман» (Гродна) — 1:0, «Днепр» (Магілёў) — «Віцебск» — 1:0. Матчы ў адказ пройдуць 21 і 22 сакавіка.

СЕЗОН «ФОРМУЛЫ-1» АДКРЫТЫ

Пераможцам першага этапу чэмпіянату свету па «Формуле-1», Гран-пры Аўстраліі, стаў англічанін Льюіс Гамільтан з каманды McLaren. У тройцы пілотаў таксама англійскія гоншчыкі — Нік Хайдфельд з BMW Sauber і Ніко Росберг з Williams. Бразілец Рубенс Барыкела з каманды Honda, які заняў шостае месца, дыскваліфікаваны за выезд з боксаў на чырвоны свет. Наступная гонка пройдзе ў Малайзіі 23 сакавіка.

КАЛАЧОЎ УКАЛАЦІЎ ГОЛ

Старт расійскага чэмпіянату па футболе прынёс першыя сюрпрызы. Фаварыты не змаглі дабіцца перамог, а турнірную табліцу ўзначаліў пермскі «Амкар». Нагадаем, што ў прэм'ер-лізе сёлета выступае 17 беларускіх футбалістаў, сярод іх у першым туры вызначыўся Цімафей Калачоў у матчы «Крылаў Саветаў» у гасцях у «Церака» (3:0). Менавіта за самарскую каманду гуляе самая вялікая колькасць нашых футбалістаў — пяць чалавек. Вынікі матчаў: ЦСКА — «Шыннік» — 1:1, «Хімкі» — «Амкар» — 0:3, «Спартак» (Нч) — «Сатурн» — 2:1, «Том» — «Дынама» — 0:0, «Луч-Энергія» — «Масква» — 1:1, «Зеніт» — «Спартак» — 0:0, «Лакаматыў» — «Рубін» — 0:1.

САМСОНАЎ ВЫЙГРАЎ У ПЕРШАЙ РАКЕТКІ СВЕТУ

Беларус Уладзімір Самсонаў упэўнена перайграў кітайскага тэнісіста Чэн Кі ў фінале адкрытага чэмпіянату Кувейта, які ўваходзіць у серыю «Про-Тур», — 4:0. На шляху да галоўнага матча наш зямляк з тым жа сухім лікам выйграў у спартсмена з Паўднёвай Карэі Рае Ен Чэ і Генсая Менге з Турцыі. Беларус таксама перамог першую ракетку свету кітайца Вань Хао — 4:1. Самым жа напружаным для Самсонава аказаўся паўфінал, дзе ён ледзь не ўступіў прадстаўніку Паднябеснай Ма Лоню — 4:3.

Абзац

● **Будаўніцтва веласіпеднай трасы пачата ў Мінску, паведаміў дырэктар КУП «УКБ Мінгарвыканкама» Андрэй Галь на аператыўнай нарадзе ў мэрыі. Спартыўны аб'ект пройдзе ўздоўж ракі Свіслач праз тры раёны сталіцы — Партызанскі, Першамайскі і Ленінскі. Агульная працягласць аб'екта складзе 27 км. Здаць у эксплуатацыю велатрасу плануецца да канца 2008 года.**

● 16 сакавіка на трасе Мазыр — Оўруч у выніку лабавога сутыкнення легкавых аўтамабіляў «Аўдзі» і «Мазда» адбылося зіграванне маторнага адсека апошняга. Па шчаслівай выпадковасці намеснік начальніка Нараўлянскага аддзела па надзвычайных сітуацыях Сяргей Бялько змог першым прыйсці на дапамогу пацярпелым. Ён дастаў з палаючай машыны 12-гадовую дзяўчынку, якая знаходзілася ўжо ў непрытомным стане. Неўзабаве на дапамогу ратавальніку падаспелі аўтааматары, якія праязджалі міма, і пачалі тушыць «Мазду». Аварыйна-выратавальныя брыгады МНС, якія прыехалі на месца здарэння, дасталі з машыны таксама жанчыну з траўмамі галавы і мужчыну, загінулага ў выніку аварыі. Пацярпелыя жанчына і дзяўчынка знаходзяцца ў рэанімацыі. Кіроўца «Аўдзі», 1984 года нараджэння, які знаходзіўся ў нецвярозым стане, не пацярпеў.

● **47-гадовы непрацуючы жыхар вёскі Ліпаўка Хоцімскага раёна прычыніў агнястрэльнае раненне 34-гадоваму жыхару Клімавіцкага раёна, які знаходзіўся ў яго ў хаце, а затым выйшаў на вуліцу і ўчыніў два стрэлы па мясцовых жыхарах, якія праходзілі па вуліцы, параніўшы аднаго ў плячо, а другога ў сцягно. Параненыя мужчыны шпіталізаваныя, ім аказана медыцынская дапамога. Вядзецца праверка.**

● Папулярная зорка савецкага кіно Нона Мардзюкова, якая перанесла за апошнія чатыры гады інфаркт і інсульт, на «хуткай дапамозе» была дастаўленая ў псіхіятрычнае аддзяленне Цэнтральнай клінічнай бальніцы Масквы з дыягназам «дэменцыя» (распад псіхічных функцый).

● **41-гадовая ўладальніца «Оскара» Хэлі Бэры нарадзіла сваё першае дзіця. Дачка актрысы з'явілася на свет у мінулую нядзелю раніцай у адной з бальніц Лос-Анджэлеса. Вага дзяўчынкі — 3200 грамаў. Бацька дзіцяці — 31-гадовы манекеншчык Габрыэль Обры, з якім Хэлі пазнаёмілася ў 2005 годзе. З таго часу яны жывуць разам, аднак афіцыйна не жанатыя.**

Поўны абзац

● Жыхарка Пакістана ўстанавіла абсалютны рэкорд: яна зацяжарала ва ўзросце 80-ці гадоў. Як паведамляе мясцовая прэса, Куршыд Бібі выявіла, што знаходзіцца ў цікавым становішчы пасля таго, як яе сталі турбаваць болі ў жываце. Медыцынскае абследаванне паказала, што яна, да найвялікшага здзіўлення свайго мужа і лекараў, цяжарная. Паводле слоў медыкаў, сама бабулька была нямала занепакоеная сваім становішчам. Яна вельмі збянтэжылася і стала нервавацца, не ўяўляючы, як сказаць аб гэтым унукам, многія з якіх ужо досыць сталыя, каб мець сваіх дзяцей. Яна замужам з 1950 года, і з тых часоў у іх нарадзілася ўсяго адно дзіця. Яны заўсёды жадалі мець дзяцей яшчэ, але да сённяшняга моманту ім гэта не ўдавалася. Дарэчы, 2 гады таму муж Куршыд Бібі хадзіў да празорцы, які прадказаў яму нараджэнне другога малога, але тады дзядок не паверыў вешчуну. Лекары заявілі, што роды будуць вельмі складанымі, аднак жанчына вырашыла падпарадкавацца прыродзе і нарадзіць дзіця.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармацыйных агенцтваў.

ТАЙНЫ «МЫШАГА» РЫНКУ

Кожную нядзелю іду на рынак, які ў нас іншым разам называюць барахолкай, ці на заходні манер — «блышыным», альбо «мышыным». Ён знаходзіцца побач — на стадыёне.

На такі рынак нясуць усё, што дома заляжалася, што стала непатрэбным, але ёсць надзея зарабіць на такой рэчы невялікія грошы. Ужыванае прадаюць людзі бедныя, як правіла, пенсіянеры, а побач з імі гандлююць новым таварам: інструментамі, электрапрыладамі, сантэхнікай… Тут ёсць рэчы, якія могуць зацікавіць і калекцыянераў, аматараў старызны. Але не ўвесь тавар ляжыць навідавоку і часта прадавец і пакупнік стараюцца не прыцягваць увагу выпадковых людзей — іх здзелкі праходзяць непрыкметна.

ЗАКОН ДУЖАГА

Прадаўцы на «мышыным» дзеляцца на дзве катэгорыі. Самая вялікая група — пенсіянеры, якія раскладваюць свой тавар на асфальце алеяў стадыёна, а да другой можна аднесці тых, хто гандлюе ў палатках ці на сталах. Справу сваю апошнія ўжо раскруцілі, і яна дае добры прыбытак. Здавалася б, кожны займаецца сваім бізнэсам і ніхто нікому не перашкаджае, але гэта не так.

На рынку некалькі чалавек працуюць сямейным падрадам. Напрыклад, мужчына з сынам і зяцем займаюць тры месцы і гандлююць адным і тым жа таварам. Яны трымаюць пад кантролем сваю нішу, устанаўліваюць адзіную цану і ніхто ўжо не можа перайсці ім дарогу — прадаваць такія ж рэчы.

Адноўчы мяне здзівіла, што наждачка прадаецца толькі ў некалькіх чалавек, а раней амаль кожны ёю гандляваў. Спытаў у жанчыны, якая стаяла за столікам і пачуў, што наждачку прадаваць ёй забаранілі.

— Як забаранілі? Хто мае права?

— Ёсць тут манапалісты.

— Няўжо пагражаюць расправай? — дапытваўся я.

— Расправа тут простая. Будзе праходзіць міма і штурхане мой столік. Пасля гэтага буду я да канца дня падбіраць з зямлі гайкі ды шрубы. Такое ўжо здаралася, хоць і не са мною, — растлумачыла жанчына.

І яе можна зразумець, бо хто прадаўца абароніць? Міліцыянеры на рынку — госці рэдкія, ды і што можна даказаць?

Дарэчы, прадаўцоў-жанчын на «мышыным» многа, хоць тавар у асноўным мужчынскі, звязаны з металам. Некаторыя гандлююць на пару, з сынамі-падлеткамі.

ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА І ЖАЛЕЗНЫ КРЫЖ

«Куплю ордэны, медалі, манеты...» — такія шыльдачкі трапляюцца на вочы часта, ляжаць на асфальце, наклеены на аўтапрычэпы... Некалькі чалавек толькі на гэтым і спецыялізуюцца. Але не трэба думаць, што гэтыя прадаўцы-калекцыянеры заплацяць вам рэальную цану за нейкую манету. Яны расклалі значкі, усякую драбязу, а самі чакаюць, што раптам нехта падыдзе і прапануе набыць сапраўды каштоўную рэч. Якая цана таго ці іншага ордэна, такія калекцыянеры не скажуць, а захочуць рэч убачыць на свае вочы, патрымаць у руках і прапануюць сімвалічную цану.

А тое, што на рынку прадаецца адкрыта, не мае вялікай каштоўнасці. Відэльцы і лыжкі, срэбра з якіх злізаў час і людзі, самавары, прасы, манеты савецкага перыяду і царскія з выявай Мікалая II... усё гэта для сур'ёзнага калекцыянера — рэчы другарадныя. Рэдкія экспанаты ўжо прайшлі сіта адбору, і на «мышыны» трапіла тое, што прасеялася.

Вось на кардоне ляжаць вайсковыя распазнавальныя знакі. Сёння толькі савецкія, а нейкі тыдзень таму побач знаходзілася і фашысцкая сімволіка. Ляжыць Чырвоная зорка, а крыху збоку — жалезны крыж. Маладога мужчыну, які стаіць тут з году ў год, асабліва цікавіць атрыбутыка часоў Другой сусветнай вайны. Але зноў жа, пра гэта трэба гаварыць «тэт-а-тэт». Даводзілася бачыць, як прадавец адыходзіў з чалавекам убок і разглядваў нейкія рэчы.

Неяк паспрабаваў уступіць у размову з прадаўцом і я, але адразу зразумеў, што надзеі на адкрытасць няма. Гаворка можа ісці пра канкрэтную рэч. Хочаш прадаць ці нешта купіць, тады і ёсць тэма для размовы.

А на другім канцы алеі мужчына з бародкай а-ля Калінін прапаноўвае этнаграфічныя прадметы народнага побыту. Але побач з гладышом, верацяном, прасам ляжаць рэчы, выкапаныя з зямлі, відавочна, з салдацкіх магіл. Біклагі, лыжкі з відэльцамі, клямар, медальён... яны пашкоджаныя іржой, але прыцягваюць увагу цікаўных. На пытанне: «Адкуль?» стандартны адказ: «Адзін вось прапанаваў, то і купіў. А дзе ён узяў, мне невядома».

Партупея, кабура, фуражка... — афіцэрская амуніцыя на рынку не рэдкасць, але ўспамінаюцца дзевяностыя, бо тады вайсковых рэчаў на «мышыным» было асабліва многа. Ваенныя рацыі, прыборы начнога бачання, гадзіннікі з танкаў, а авіязапчасткі ляжалі навалам. Сёння гэтага багацця няма. Паспелі распрадаць, ды і цягнуць няма адкуль.

БЕЗ БАЗАРУ

Можна не сумнявацца, што тут збываецца кантрабандны ды і крадзены тавар. Асабліва многа на рынку прадаецца электраінструментаў. Тавар імпартны, а каштуе значна танней, чым у магазіне. Напрыклад, электрагэблік фірмы «Einhell» можна купіць за 120 тысяч, а ў магазіне ён 150—160 тысяч рублёў. Але не трэба спяшацца. Гэты ж інструмент можна набыць вельмі танна. Трэба звярнуць увагу на тых, хто хоча прадаць адзін экзэмпляр. Вось мужчына просіць за такі ж гэблік 90 тысяч рублёў. Упакоўка, інструкцыя, як і інструмент, у парадку, а цана падазрона нізкая. І «балгарка» той жа фірмы ў другога прадаўца амаль удвая таннейшая за рэальную цану. Пачынаю цікаві

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

Полн. наименование:

Открытое акционерное общество «Белремстройсвязь»

Адрес: **220049 г. Минск, пер.Чайковского, 3.** Т/ф. **263 43 11**
Полное ф.и.о руководителя: **Тарасенко Анатолий Владимирович**
Полное ф.и.о гл. бухгалтера: **Погодина Людмила Владимировна**
Единица измерения: **млн. руб.**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2008 года

	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
АКТИВ			
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	10526	11963
Нематериальные активы	120	5	5
Доходные вложения в материальные ценности	130		
Вложения во внеоборотные активы	140	1	44
В том числе: незавершенное строительство	141		44
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	190	10532	12012
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	1359	2472
В том числе:			
сырье, материалы и другие активы	211	1288	2147
животные на выращивании и откорме	212		
незавершенное производство и полуфабрикаты	213	18	8
расходы на реализацию	214		
готовая продукция и товары для реализации	215	16	64
товары отгруженные	216		
выполненные этапы по незавершенным работам	217		
расходы будущих периодов	218	37	253
прочие запасы и затраты	219		
Налоги по приобретенным активам	220	160	65
Дебиторская задолженность	230	4525	4356
В том числе:			
покупателей и заказчиков	231	4068	3917
поставщиков и подрядчиков	232	373	397
разных дебиторов	233	29	31
прочая дебиторская задолженность	234	55	11
Расчеты с учредителями	240		
В том числе:			
по вкладам в уставный фонд	241		
Прочие	242		
Денежные средства	250	694	1138
В том числе:			
денежные средства на депозитных счетах	251	300	
Финансовые вложения	260		3
Прочие оборотные активы	270	3	59
ИТОГО по подразделу II	290	6741	8093
БАЛАНС	**300**	**17273**	**20105**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	993	993
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411		
Резервный фонд	420	58	70
В том числе:			
резервы, созданные в соответствии с законодательством	421		
резервы, созданные в соответствии с учредительными документами	422	58	70
Добавочный фонд	430	10983	12260
Прибыль (убыток) отчетного периода	440		
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	450	1976	2545
Целевое финансирование	460		
Доходы будущих периодов	470	1	
ИТОГО по разделу III	490	**14011**	**15868**
IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		
Краткосрочные кредиты и займы	520	55	106
Кредиторская задолженность	530	3205	4122
В том числе:			
перед поставщиками и подрядчиками	531	1411	2243
перед покупателями и заказчиками	532	916	631
по оплате труда	533	413	485
по расчетам с персоналом	534	6	12
по налогам и сборам	535	284	546
по социальному страхованию и обеспечению	536	149	178
разных кредиторов	537	26	27
прочая кредиторская задолженность	538		
Задолженность перед учредителями	540	2	9
В том числе:			
по выплате доходов, дивидендов	541	2	9
прочая	542		
Резервы предстоящих расходов	550		
Прочие виды обязательств	560		
ИТОГО по разделу IV	590	**3262**	**4237**
БАЛАНС	600	**17273**	**20105**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

НАИМЕНОВАНИЕ ПОКАЗАТЕЛЯ	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	32109	25319
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	5514	4031
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-020)	020	26595	21288
Из строки 010 сумма государственной помощи на покрытие разницы в ценах и тарифах	021		
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	24361	20002
Управленческие расходы	040		
Расходы на реализацию	050		
Прибыль (убыток) от реализации (020-030-040-050)	060	2234	1286
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	070	883	2655
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	071	119	379
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	080	764	2276
В том числе:			
От сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	081		
От выбытия основных средств и нематериальных активов	082	22	2058
Прочие операционные доходы	083	742	218
Операционные расходы	090	696	1047
В том числе:			
От сдачи активов в аренду, лизинг, временное пользование	091		1
От выбытия основных средств и нематериальных активов	092	3	873
Прочие операционные расходы	093	693	173
Прибыль (убыток) от совместной деятельности	100		
Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций	110		
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (080-090±100±110)	120	68	1229
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	272	353
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	3	
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	269	353
В том числе:			
От списания кредиторской задолженности	141	12	35
Курсовые и суммовые разницы	142	8	
Безвозмездно полученные активы (включая денежные средства и суммы государственной помощи)	143		
Прочие внереализационные доходы	144	249	318
Внереализационные расходы	150	653	302
В том числе:			
От списания дебиторской задолженности	151	3	
Курсовые и суммовые разницы	152	3	
Безвозмездно переданные активы (включая денежные средства)	153	11	3
Прочие внереализационные расходы	154	636	299
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-384	51
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (060+120+160)	200	1918	2566
Налоги и сборы, производимые из прибыли	210	733	771
Прочие расходы и платежи из прибыли	220	11	
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220)	240	1174	1795
Справочно (из строки 240). Сумма льготы по налогу на прибыль			

Данные отчетности подтверждены *(наименование и номер лицензии аудиторской организации или наименование контролирующего органа, проводившего проверку)*							
Кол-во акционеров	**Всего**	**1928**	**В том числе:**	**Юридических лиц**	**10**	**Физических лиц**	**1918**

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	*Миллионов рублей*	**117**	**178**
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	*Рублей*	**295**	**448**
Обеспеченность акции имуществом общества	*Тысяч рублей*	**40**	**35**
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	*Штук*		
ИНФОРМАЦИЯ О ЗАДОЛЖЕННОСТИ			
Просроченная дебиторская задолженность	*Миллионов рублей*	**392**	**429**
Просроченная кредиторская задолженность	*Миллионов рублей*	**32**	**40**
Среднесписочная численность работающих (человек)		**715**	
Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг		**строительство**	

13 марта 2008 года УНП 100347020

ПАДАТКОВЫЯ ЛЬГОТЫ ПРЫ БУДАЎНІЦТВЕ ІНДЫВІДУАЛЬНАГА ЖЫЛЛЯ

Пытальнік

Якія льготы прадугледжаны для грамадзян, якія будуюць жыллё за кошт уласных сродкаў (без прыцягнення крэдыту) і якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў?

Аляксандр ЛАГУН, *г. Пінск.*

— Згодна з дзеючым заканадаўствам, — адзначылі ў прэс-цэнтры Міністэрства па падатках і зборах, — падаткаплацельшчык мае права на атрыманне маёмаснага падатковага выліку па фактычнай суме расходаў на новае будаўніцтва. Такая льгота прадугледжана для забудоўшчыка і членаў яго сям'і, калі яны мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Пры новым будаўніцтве індывідуальнага жылога дома ці кватэры фактычна зробленыя плацельшчыкамі і членамі іх сем'яў расходы на такое будаўніцтва падлягаюць выліку ў межах каштарыснай вартасці кошту індывідуальнага дома або кватэры.

Маёмасны падатковы вылік даецца кліенту на падставе яго пісьмовай заявы і наступных дакументаў:

— даведкі мясцовага выканаўчага органа ці іншага дзяржаўнага органа і дзяржарганізацый, арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці па месцы працы (службы) аб тым, што плацельшчык і члены яго сям'і знаходзяцца на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў;

— выпіскі (копіі) з рашэння агульнага сходу членаў арганізацыі грамадзян-забудоўшчыкаў аб уключэнні плацельшчыка або члена яго сям'і ў склад жыллёва-будаўнічага кааператыва ці копіі дагавора аб будаўніцтве пры ўдзеле ў ЖБК, паводле метаду долевага будаўніцтва;

— копіі дзяржаўнага акта на права пажыццёвага валодання або на права прыватнай уласнасці на зямельны ўчастак, які дадзены для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома, — пры будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў;

— даведкі (копіі) забудоўшчыка або падрадчыка аб каштарыснай вартасці будаўніцтва індывідуальнага жылога дома (кватэры) у бягучых цэнах, а таксама аб фактычным кошце выкананых работ і выдаткаў на будаўніцтва — пры будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў (кватэр), або заявы фізічнай асобы аб каштарыснай вартасці будаўніцтва індывідуальнага жылога дома, калі яно ажыццяўлялася без прыцягнення забудоўшчыка ці падрадчыка. У гэтым выпадку ўказаны кошт будаўніцтва звяраецца службовай асобай падатковага органа з праектнай дакументацыяй па будаўніцтве;

— копіі дагавора на набыццё тавараў (выкананне работ, аказанне паслуг), што выкарыстоўваліся пры будаўніцтве індывідуальных жылых дамоў. Пры набыцці такіх тавараў у фізічнай асобы, якая не з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, у дагаворы трэба ўказваць прозвішча, імя, імя па бацьку, месца жыхарства, пашпартныя даныя гэтай фізічнай асобы;

— дакументаў, што паказваюць фактычную аплату тавараў (работ, паслуг, у тым ліку рыэлтарскіх паслуг);

— копіі пасведчання аб нараджэнні дзіцяці (дзяцей), копіі пасведчання аб шлюбе, копіі рашэння суда — пры атрыманні маёмаснага падатковага выліку членамі сям'і;

— даведкі аб даходах плацельшчыка.

Калі на працягу 2008 года маёмасны падатковы вылік немагчыма выкарыстаць цалкам, тады астатак яго пераносіцца на наступныя падатковыя перыяды да поўнага яго выкарыстання.

Маёмасны падатковы вылік даецца плацельшчыку па месцы асноўнай працы на працягу падатковага перыяду і (або) пры падачы забудоўшчыкам падатковай дэкларацыі ў падатковыя органы па выніках года.

Падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

МАЕ ВАЛАСЫ — МАЁ БАГАЦЦЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Хто ведае, можа, калісьці брыльянты «з валоссем» будуць запатрабаваныя і ў нас, на гэты выпадак хочам супакоіць: расставацца з усёй шавялюрай не давядзецца — для сінтэзу нават некалькіх «порцый» алмазаў дастаткова аднаго локана масай усяго толькі каля 2,5 грама. Атрыманая з яго сыравіна прымешваецца да графіту ў мізэрных долях (літаральна некалькі працэнтаў ад аб'ёму асноўнай сыравіны), а вось самога графіту спатрэбіцца разы ў тры больш у параўнанні з той масай брыльянтаў, якую разлічваюць атрымаць у выніку. Індывідуалізаваную сыравіну пры сінтэзе алмазаў прадбачліва дзеляць на некалькі заходаў:

— З першай спробы могуць атрымацца ці занадта дэфектныя ці занадта дробныя камяні, якія не адпавядаюць патрабаванням заказу.

Уладзімір Фядорчанка азнаёміў нас і з прыкладным прэйскурантам на сінтэзаваныя камяні:

— Неапрацаваны камень (алмаз) сярэдніх памераў каштуе каля 100 долараў за карат (200 мг), агранёны камень (брыльянт), возьмем усярэднены варыянт у чвэрць карата, без лішніх прыдумак, вытанчанасцяў і «наваротаў» пацягне на 150 долараў (а ваганні могуць быць ад 10 да 6000 долараў, у залежнасці ад памераў і чысціні брыльянта). Адзін карат брыльянта ідэальнай чысціні будзе каштаваць каля 6000 долараў. Калі ж гэта эксклюзіўны («валасяны») брыльянт, то «каратнік» наўрад ці атрымаецца — малаверагодна, што такі камень вырасце, таму што прымесі крыху змяняюць памеры і чысціню сінтэзаваных камянёў. У агранёным выглядзе такі брыльянт атрымаецца не болей чым паўкарата і лік пойдзе на тысячы долараў. Кошт вызначае не столькі сама тэхналагічнасць працэсу, колькі падрыхтоўчыя працы і ідэнтыфікацыя — яны абыходзяцца куды даражэй, чым сам сінтэз алмазу.

Як жа фарміруецца алмаз?

— Ён узнікае тады, калі вугляродны набывае крышталічную форму, — тлумачыць Уладзімір Фядорчанка, — для гэтага патрэбны неверагодна высокія ціск (не менш за 50 тыс. атмасфер) і тэмпература (звыш паўтары тысячы градусаў). На гэта здольныя нетры зямлі — і тады атрымліваюцца прыродныя алмазы, і... апараты сінтэзу. Калі ўздзеянне тэмпературы і ціску кароткачасовае, то фарміруюцца парашковыя алмазы — дробныя, якія недзе зляпіліся адно з адным, а недзе наадварот раскалоліся на драбіначкі. Монакрышталі — адносна буйныя памераў асобныя камяні — у адрозненне ад парашковых алмазаў «вырошчваюць» некалькі дзён. Спецыяльныя ўстаноўкі імітуюць працэсы, якія адбываюцца ў нетрах зямлі пры фарміраванні самародкаў — уздзеянне ціску ідзе па ўсіх накірунках.

Васіль БУБІЧ не па чутках ведае, як «вырошчваюцца» алмазы ў апаратах сінтэзу.

Гэтыя машыны здольныя не толькі вырошчваць алмазы, але і «фарбаваць» іх (прычым і прыродныя камяні таксама): «нараджаюцца» сінтэзаваныя камяні ўсе адналькавага каньячнага колеру, адна на заказ кліента іх можна зрабіць фантазійнага колеру (гэты тэрмін азначае, што ступень інтэнсіўнасці адцення каменю адрозніваецца ад базавай) — розных адценняў жоўтага (ад канарэечнага — да лімоннага), зялёнага і аранжава-карычневага. Праўда, каштаваць каляровыя каменьчыкі будуць ажно на 75 працэнтаў больш — дадатковыя тэхналагічныя працэсы вымагаюць дадатковых грошай. У хуткім часе ў вытворчасці з'явяцца і бардовыя каменьчыкі. А вось белых і блакітных брыльянтаў пакуль няма і ў планах — яны ствараюцца па іншай, яшчэ больш дарагой тэхналогіі.

> Для ўпрыгажэнняў выгадней набываць сінтэтычныя камяні: яны могуць каштаваць у два — дзесяць разоў менш, чым прыродныя

«Фантазіраваць» можна і з агранкай: напрыклад, заказаць камень у форме квадрата, конуса ці падобнай да мяча для рэгбі.

А як паказваюць сябе сінтэтычныя камяні ў параўнанні з прыроднымі брыльянтамі?

— Цвёрдасць, электраправоднасць і аптычныя ўласцівасці (усякія там праламленні, якія забяспечваюць бляск, ігру) у іх тыя ж, — запэўніў нас Уладзімір Міхайлавіч. — А вось цеплаправоднасць нават вышэйшая, дзякуючы гэтаму яны могуць быць больш запатрабаванымі ў электроніцы, чым натуральныя алмазы (у прымяненні датчыкаў, цеплаадводаў і г.д.). Кошт алмазаў на тэхнічныя патрэбы блізкі да цаны прыродных камянёў. Па-першае, з-за таго, што на гэтыя мэты расходуюцца самі па сабе танныя прыродныя алмазы — нізкай якасці, незапатрабаваных колераў (шэрых, карычневых). Па-другое, таму што прыродных камянёў правільных формаў для тэхнічных патрэб становіцца ўсё менш, а патрэбы прамысловасці наадварот, павялічваюцца, і з кожным годам гэты дэфіцыт становіцца ўсё больш адчувальным. Так што істотнай выгады для пакупнікоў тут няма, хіба што сінтэтычныя алмазы даступныя, а прыродных практычна не існуе. Затое вось для ўпрыгажэнняў выгадней набываць сінтэтычныя камяні: яны могуць каштаваць у два — дзесяць разоў менш, чым прыродныя. Пры вытворчасці сінтэтычных алмазаў атрымліваецца значна больш «чыстых» камянёў (без дэфектаў — сколаў, трэшчынак), чым тады, калі за справу бярэцца прырода: там атрымліваецца ўсяго працэнтаў 10—15 бездэфектных алмазаў.

Брыльянтавыя ўпрыгажэнні не пакінуць абыякавай ні адну жанчыну, ў прынцыпе як і прыгожая жанчына не пакіне абыякавым ніводнага мужчыну. Сінтэтычныя алмазы, ці натуральныя... няблага, каб яны проста ў нас былі. Тое ж і з валасамі: заключаныя ў брыльянт ці багата ўбраныя на галаве — усё адно наша багацце, няхай яно проста будзе!

Ала МАЧАЛАВА.
Фота аўтара.

Зноў аб помніку Я. Купалу і Я. Коласу ў Варшаве

У пасольстве Беларусі ў Польшчы адбылася сустрэча пасла Паўла Латушкі з членамі грамадскага камітэта пабудовы ў Варшаве помніка Янку Купалу і Якубу Коласу.

Нагадай для яе правядзення стаў адказ на зварот камітэта да мэра Варшавы аб падтрымцы ідэі і месцы пабудовы помніка. У атрыманым лісце вітаецца «каштоўная ініцыятыва» стварэння помніка, але выказваецца меркаванне аб неабходнасці пошуку новага месца для яго ўстаноўкі. Прычына — тэрыторыя каля Варшаўскага ўніверсітэта і новага будынка яго бібліятэкі ўжо насычана помнікамі і знаходзіцца пад аховай. У лісце таксама выказана прапанова аб пераўтварэнні грамадскага камітэта ў камітэт пабудовы помніка Я. Купалу і Я. Коласу з правамі юрыдычнай асобы. Гэта дазволіла б камітэту выконваць функцыі інвестара, садзейнічала б хутчэйшаму атрыманню неабходных узгадненняў, паскарэнню падрыхтоўкі дакументацыі, вырашэнню іншых пытанняў.

Нагадаем, ідэя пабудовы помніка Я. Купалу і Я. Коласу з'явілася адначасова з адкрыццём у Мінску помніка Адаму Міцкевічу (ужо чацвёртага на Беларусі). Ініцыятыва была падтрымана ў 2004 годзе тагачасным мэрам Варшавы Лехам Качыньскім, міністэрствам культуры Польшчы, рэктарам Варшаўскага ўніверсітэта.

Леанід ТУГАРЫН.

Кватэрнае пытанне

Калі ўзводзіць не гмах...

Мы стаім на кватэрным уліку, збіраемся будаваць уласны дом. Участак ужо выдзелены. Але перад пачаткам будаўніча-мантажных работ, кажуць, трэба яшчэ атрымаць дазвол органаў дзяржбуднагляду. Ці так гэта?

А. МЕЛЯШКЕВІЧ.

У пераліку аб'ектаў, для ўзвядзення якіх не патрабуецца атрыманне дазволу органаў дзяржаўнага будаўнічага нагляду на вытворчасць будаўніча-мантажных работ (зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 кастрычніка 2006 года № 1387) індывідуальныя жылыя дамы вышынёй да двух паверхаў уключна з інжынерным забеспячэннем і гаспадарчыя пабудовы (прыбудовы) на прыдамавой тэрыторыі. Да такіх аб'ектаў аднесены і аднапавярховыя гаражы, будаўніцтва якіх ажыццяўляецца за кошт уласных сродкаў фізічных асобаў.

Акрамя таго, не патрабуецца атрымання ўказанага дазволу пры ўзвядзенні гаспадарчых аднапавярховых збудаванняў, прыбудоў плошчай да 30 кв. метраў, якія маюць дачыненне да сельскагаспадарчай вытворчасці і дапаўняюць прысядзібную забудову ў сельскай мясцовасці, а таксама пры агароджванні прысядзібных участкаў індывідуальных жылых дамоў.

Віктар САВІЦКІ.

Рэха публікацыі

Катка ўжо няма. Але праблемы былі

У нумары «Звязды» ад 6 лютага пад рубрыкай «Гарачы» тэлефон» была змешчана скарга мінчаніна на тое, што на штучным катку ў Заводскім раёне, які на той час быў папулярным месцам адпачынку і дзятвы, і дарослых, неаднойчы назіраліся факты распіцця піва і нават спіртных напояў моладдзю, найперш падлеткамі. Прычым часта — на вачах у наведвальнікаў, у тым ліку і дзяцей. Публікацыя мела загаловак «Культуру паводзінаў на катку адновіць міліцыя...».

Афіцыйнае рэагаванне з адміністрацыі Заводскага раёна рэдакцыя атрымала 13 сакавіка. Фармальна тэрміны разгляду матэрыялу практычна не парушаны — адказ дадзены на працягу месяца. Справа ў іншым. Катка таго па аб'ектыўных прычынах ужо пэўны час як не існуе. Калі б на выступленне газеты адрэагавалі больш аператыўна, учарашнім наведвальнікам лядовай пляцоўкі гэты адказ быў бы цікавым і карысным яшчэ сёлета. А так даведацца толькі спадзявацца, што ўсё ніжэй выкладзенае спраўдзіцца хоць бы ў наступным сезоне.

Такім чынам, газеце пацвярджаюць — факты, выкладзеныя намі, мелі месца. «Абслуговаму персаналу мабільнага катка, што складаецца пераважна з жанчын, сапраўды вельмі цяжка навесці парадак сярод шматлікіх наведвальнікаў і асабліва — сярод падлеткавай моладзі. Некаторыя падлеткі практычна некіруемыя. Грубіяняць і пагражаюць абслуговаму персаналу.

Адміністрацыяй Заводскага раёна дадзены канкрэтныя даручэнні начальніку РУУС па падтрыманні грамадскага парадку на мабільным катку. Дадаткова правапарадак будзе забяспечвацца штодзённымі нарадамі 1-й роты палка ППСМ ГУУС Мінгарвыканкама.

За час працы мабільнага катка затрымана і прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці больш за 40 чалавек, у асноўным — за распіццё алкагольных напояў у грамадскім месцы або з'яўленне ў грамадскім месцы ў п'яным стане. У дапамогу міліцыі ў дзённы час для падтрымання грамадскага парадку на мабільным катку прыцягнуты члены раённай добраахвотнай дружыны.

Пытанні, звязаныя з падтрыманнем грамадскага парадку на мабільным катку ў мікрараёне Чыжоўка, знаходзяцца на пастаянным кантролі адміністрацыі Заводскага раёна».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Внимание — олимпиада

Факультет прикладной математики и информатики Белорусского государственного университета объявляет о начале

XVII ОЛИМПИАДЫ ПО МАТЕМАТИКЕ И ИНФОРМАТИКЕ для учащихся старших классов

Олимпиада пройдет в два тура (первый — заочный). Участниками могут быть учащиеся средних школ, гимназий, лицеев, колледжей, а также учащиеся средних специальных и профессионально-технических учебных заведений Республики Беларусь.

